**Прыродная кладоўка мае сваё дно.**



З яе трэба не толькі браць, але і аддаваць.

Мядзельскі раён заварожвае сваёй прыгажосцю, блакітнымі азёрамі, лясамі. Тут дбаюць пра тое, каб захаваць першапачатковасць тутэйшых мясцін. Адначасова і прыцягнуць сюды як мага больш турыстаў. Паводле Дзяржаўнай праграмы развіцця Нарачанскага краю, тут створаны новыя аб'екты з максімальным захаваннем ужо існуючага прыроднага асяроддзя. Шматлікія госці едуць сюды не толькі адпачыць, але і адкрыць для сябе прыроду нанава.

Адзін з такіх надзвычай цікавых куткоў — дэндрасад Нацыянальнага парку “Нарачанскі”. Раскінуўся ён паміж двума буйнымі і найпрыгажэйшымі азёрамі Нарач і Мястра — на натуральным перашыйку з унікальным прыродным ландшафтам. Яго плошча 16 гектараў, перанад вышынь — да 9 метраў. Тэрыторыя ўваходзіць у склад так званай Свянцянскай грады беларускага Паазер'я. У гэтым незвычайным кутку захаваны разнастайныя прыродныя комплексы, характэрныя для рэгёна: лясныя масівы ельніку, беразняку, ясеню, дубровы. А ў самай нізіне месціцца балота з уласцівымі для яго раслінамі, многія з якіх занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Тут гняздзяцца рэдкія пералётныя і вадаплаўныя птушкі. Пасярэдзіне балота змайстравала хатку даволі вялікая сям'я баброў. Усю гэтую прыгажосць можна пабачыць, не зыходзячы з дарожак, што праходзяць праз сад, пранікнуцца ўнікальнасцю прыроды, адчуць і зразумець, што яна вельмі крохкая і мае патрэбу ў клопаце і абароне.

— Пры закладцы дэндралагічнага саду мы імкнуліся максімальна захаваць натуральныя прыродныя віды, — распавяла яго загадчыца Таццяна Станкевіч. — Перш за ўсё, мелі на мэце экалагічную асвету і захаванне прыроднага багацця гэтага рэгіёна, стварэнне калекцыі раслін, што не растуць у Беларусі, так званых рэпрадуцэнтаў. Сярод іх і пахучыя нрыправы, і зёлкі.

**Храм лесу**

На тэрыторыі саду працуе музей лесу. Яго будынак узведзены ў выглядзе шматгранніка, з дрэва, якое захоўвае прахалоду летам і цяпло зімой. Гэта, можна сказаць, культавае збудаванне, храм лесу, які служыць асветніцкім мэтам, распаўсюджванню ведаў аб лесе сярод дзяцей, моладзі, дарослых. Яшчэ ў недалёкім мінулым лес лічыўся невычарпальнай кладоўкай прыроды, але ўжо ў XX стагоддзі людзі зразумелі, што гэтая кладоўка мае сваё дно.

— Мы імкнёмся давесці нашым турыстам, што лес трэба берагчы, песціць, нельга карыстацца яго дабротамі бясконца, не даючы нічога ўзамен. Наведвальнікі могуць бачыць як з маленькага зярнятка вырастае вялікае дрэва. Дарослым людзям цікава азнаёміцца з пабочным лесакарыстаннем, прадуктамі перапрацоўкі драўніны, матэрыяламі, што нарыхтоўваюцца ў лесе, даведацца пра лекавыя ўласцівасці лясных раслін, — кажа Таццяна Уладзіміраўна.

Кожны сектар прысвечаны адной лесаўтваральнай народзе: сасне, бярозе, асіне, вольсе чорнай, дубу, елцы. І ў кожным можна даведацца пра адметнасці таго ці іншага дрэва. Напрыклад, маладыя сосны ў першы год жыцця вельмі падобныя на маленькія пальмы. У бярозавым гаі я пачула шмат цікавага і карыснага пра якасці бярозавіка, лекавых уласцівасцях лісця бярозы, чагі, што расце на яе ствалах.

Зацікавіла і міні-дуброва. На Мядзелынчыне вельмі шануюць дубы. Не чапаюць іх нават падчас санітарнай высечкі. Гэта самая каштоўная парода, якой прырода шчодра адарыла Нарачанскі край. Тутэйшыя дубы па сваіх спажывецкіх якасцях намнога пераўзыходзяць нават сваіх амерыканскіх супляменнікаў. А яшчэ дубовыя лясы надта любяць сойкі, якія назапашваюць жалуды на зіму і часта забываюць, куды іх схавалі. Дзякуючы ім з'яўляюцца новыя маладыя дубровы. У музеі можна пабачыць і чучалы розных птушак. Птушкай гэтага года названа вушатая сава.

Яна пасялілася і ў нашым садзе, — смяецца Таццяна Уладзіміраўна. — Мы вельмі гэтаму рады, бо яна дапамагае змагацца з мышамі, якія наносяць шкоду тутэйшай флоры.

**Экзоты пад крылом "беларусаў"**

На другім паверсе размешчана аглядальная пляцоўка, адкуль можна палюбавацца навакольнымі пейзажамі, ландшафтамі і зразумець, што гэта сапраўды ўнікальнае і рэдкае па прыгажосці месца ў атачэнні азёраў Нарач і Мястра, паназіраць за жыццём баброў, гнездавых птушак. Адсюль, як на далоні, відаць пасадкі ельніку ў выглядзе сэрца. Яны выкарыстоўваюцца як ветраахоўная зона. Возера Нарач называюць морам, а на моры, як вядома, бываюць моцныя вятры, мусоны. Не меншай сілы яны і на Нарачы.

З кожным годам колькасць наведвальнікаў дэндрарыя павялічваецца, хоць гэта самы малады сад у Беларусі: асноўныя насадкі датуюцца 2005 годам. Звычайна людзі, якія хоць раз тут пабывалі, прыязджаюць сюды кожны год і бачаць нешта новае, як мяняецца, расцвітае жывая прырода.

У садзе растуць не толькі расліны, характэрныя для Беларусі, але так званыя экзоты. IIрадстаўнікі флоры Крыма, Каўказа, Сярэдняй Азіі, Паўднёвай Амерыкі, Блізкага Усходу, краін Еўропы, Сібіры. Яны былі падсаджаны да ўжо існуючых. Вялікія елкі, дубы ахоўвалі "чужынцаў" ад непагадзі, капрызнага беларускага клімату. І пад крылом беларускіх сяброў яны добра прыжыліся. Многія аматары і знаўцы прыроды адзначаюць кантраст паміж імі. Напрыклад, паміж мудрагелістай амерыканскай туяй і душэўнай, сціплай нашай бярозкай.

— Пасадачны матэрыял нам пастаўляе Мінскі батанічны сад, - зазначыла Таццяна Станкевіч. Яго супрацоўнікі курыруюць нас, кансультуюць і дзякуючы ім мы папаўняем сваю калекцыю. Летась, дарэчы, была праведзена патрыятычная акцыя — закладка алеі бэзу. Яна высаджана каля дэндралагічнага саду.

***Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ***
***Фота Надзеі БУЖАН***

Мы распавялі толькі пра некаторыя куткі Нацыянальнага парка "Нарачанскі". У наступны раз працягнем аповед аб гэтым унікальным комплексе экасістэм, гаворка пойдзе пра арыгінальны экскурсійны аб'ект — "Аптэкарскі сад".

**Источник:** Родная прырода. — 2015. — №7. —16-17.

